**Палажэнне**
**аб правядзенні раённага этапу рэспубліканскага конкурсу творчых работ «Мая сям'я, мой дом – мая Радзіма»**

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Дадзеныя ўмовы вызначаюць парадак правядзення раённага этапу рэспубліканскага конкурсу творчых работ «Мая сям'я, мой дом – мая Радзіма» (далей - Конкурс).

1.2. Арганізатарамі раённага этапу Конкурсу з'яўляецца упраўленне па адукацыі, спорту і турызму Вілейскага райвыканкама.

**2. Мэта і задачы Конкурсу**

2.1. Конкурс праводзіцца з мэтай стымулявання творчай і грамадскай актыўнасці дзяцей і моладзі, духоўнага ўзбагачэння асобы навучэнцапраз папулярызацыю станоўчыхсямейных традыцый і каштоўнасцяў, гістарычную пераемнасць пакаленняў.

2.2. Задачы Конкурсу:
умацаванне аўтарытэту сям'і ў грамадстве, павышэнне прэстыжу сям'і, ролі бацькоўства і мацярынства;
развіццё сацыяльнай актыўнасці сем'яў, актуалізацыі ролі сям'і ў выхаванні духоўнасці, маральнай культуры грамадства;
фарміраванне пачуцця гордасці, павагі і любові да сваёй сям'і, грамадзянскай адказнасці за сваю будучыню і будучыню сваёй сям'і;
эстэтычнае выхаванне і фарміраванне мастацкага густу асобы;
выяўленне і падтрымкатворчай ініцыятывы педагогаў, дзяцей і моладзі, шырокіх груп насельніцтва, аўтарскіх калектываў, якія вывучаюць і папулярызуюць сямейную праблематыку, спрыяюць захаванню сямейнай спадчыны.

**3. Удзельнікі Конкурсу**

3.1. Удзельнікамі Конкурсу з'яуляюцца навучэнцы устаноў адукацыі, творчыя сямейныя калектывы.

**4. Парадак правядзення Конкурсу**

4.1. Конкурс праводзўцца ў чатыры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў на кожным этапе:
першы этап (адборачны, люты - красавік) – ва ўстановах адукацыі;
другі этап (адборачны, май – жнівень) –раённы;
трэці этап (адборачны, верасень -кастрычнік) – абласны;
чацвёрты заключны, лістапад) –рэспубліканскі.
4.2. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:
**«Сям'я – адзінства думак і спраў»;**
**«Мая сям'я ў гісторыі малй Радзімы».**
У намінацыі **«Мая сям'я ў гісторыі малй Радзімы»** на Конкурс прадстаўляюцца:
відэаролік, у якім раскрываюцца сямейныя традыцыі аўтара работы, іх гісторыя, адзначаецца удзел сям'і ў мерапрыемствах грамадскага, спартыўнага, культурнага і творчага жыцця раёна, горада;
тэкставая анатацыя работы- кароткія звесткі аб аўтары, характарыстыка тэматычнага зместу работы, яе сацыяльнае вызначэнне.
Пры падрыхтоўцы відэаматэрыялу аўтар павінен выступіць у ролі рэжысера, аператара, сцэнарыста або акцера.
Патрабаванні да відэароліка: працягласць –да 5 звілін, тэхнічгыя параметры: фармат - .avi, .mpg, .wmv.
У намінацыі **«Сям'я – адзінства думак і спраў»** на конкурс прадстаўляецца творчая работа, якая змяшчае два раздзела:
«Сямейны партрэт» - апавяданне пра сям'ю (склад сям'і, сімволіка сям'і, сямейная песня, верш, фразы, выразы, прымаўкі, прыказкі, жарты і інш.)

«Крыніца сямейных традыцый» - апісанне сямейных традыцый (сямейных правесій, захапленняў, хобі, звычаяў, святаў, рэцэптаў страў і інш.)

Патрабаванні да творчай работы: аб’ем работы – не больш за 50 старонак фармату А4, шрыфт TIMES NEW ROMAN, памер шрыфта 14пт, міжрадковы інтэрвал- адзінарны. Конкурсныя матэрыялы ў намінацыі**«Сям’я – адзінства думак і спраў»** прадстаўляюцца ў друкаваным выглязе і на электронным носьбіце.

4.3. Для ўдзелу ў раенным этапе конкурсу неабходна да 20 жніўня прадставіць ва ўпраўленне па адукацыі, спорту і турызму Вілейскага райвыканкама (ва умовах абласного конкурсу для удзелу у абласным этапе неабходна ў перыяд з 20 па 26 жніўня 2020 года зарэгістравацца online па спасылцы https:|//forms.gle/mCiewuhBmMLuKG6).

4.4. Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных работ:

адпаведнасць умовам Конкурсу;

змястоўнасць, інфармацыйная напоўненасць;

творчасць, мастацкая прываблівасць, арыгінальнасць падачы матэрыялу.

4.5. Конкурсныя работыпавінны мець тытульную старонку на рускай і беларускай мовах (з пазначэннем вобласці, раена/горада, установы адукацыі, назава конкурсу,намінацыі), інфармацыю аб аўтары работы (прозвішча, імя, імя па бацьку, клас/група) і аб кіраўніку/кіраўніках(прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада), а таксама нумары кантактных тэлефонаў.

**5. Падвядзенне вынікаў і узнагароджванне пераможцаў і прызераў Конкурсу.**

5.1. Для правядзення вынікаў Конкурса на кожным этапе ствараецца журы, якое узначальвае старшыня. Журы вызначае пераможцаў і прызераў Конкурса.

5.2. Пераможцы і прызеры абласнога этапу Конкурсу ў кожнай намінацыі ўзнагароджваюцца дыпломамі  ўпраўлення па адукацыі, спорту і турызму Вілейскага райвыканкама.

5.3. Дадатковая інфармацыя аб правядзенні і выніках Конкурсу размяшчаецца на сайцеНацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі www.nchtdm.by

5.4. Па выніках рэспубліканскага этапу Конкурсу выдаецца зборнік лепшых работ.